ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
“ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ”

Аб’ект аўтарскага права
УДК 94(476-25) [ “1793/1991” ]

**САЦУКЕВІЧ**
**Іван Іванавіч**

# УРБАНАНІМІЯ МІНСКА (1793–1991 гг.)

**Аўтарэферат**
**дысертацыі на саісканне вучонай ступені**
**кандыдата гістарычных навук**

**па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя**

Мінск 2025

Работа выканана ў Дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Навуковы кіраўнік — **Лыч Леанід Міхайлавіч**, доктар гістарычных навук, прафесар

Афіцыйныя апаненты:

**Літвін Аляксей Міхайлавіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”

**Козак Кузьма Іванавіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Апаніруючая арганізацыя — **Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”**

Абарона адбудзецца «18» чэрвеня 2025 г. у 14.00 на пасяджэнні савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на саісканне ступені доктара гістарычных навук пры Дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1; тэлефон вучонага сакратара: 8(017) 387-85-19.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па адрасе: 220072, Мінск, вул. Сурганава, 15.

Аўтарэферат разасланы «16» мая 2025 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — В. Л. Лакіза

# УВОДЗІНЫ

Урбананімія – гэта сукупнасць урбанонімаў, ці ўнутрыгарадскіх назваў, якія разам складаюць унікальны, уласцівы толькі нейкаму аднаму населенаму пункту ўрбананімны ландшафт. Гэта найменні вуліц, завулкаў, плошчаў, праспектаў, паркаў, сквераў, прадмесцяў, пасёлкаў, мікрараёнаў, раёнаў. Унутрыгарадскія назвы Мінска, таксама як і помнікі археалогіі, архітэктуры, культуры, з'яўляюцца гісторыка-культурнай спадчынай сталіцы Рэспублікі Беларусь. Урбанонімы адлюстроўваюць сацыяльна-эканамічныя, рэлігійныя, нацыянальныя, прыродныя, палітычныя ўмовы існавання горада, у якіх яны ўзнікалі, развіваліся, змяняліся і знікалі.

Пасля атрымання Рэспублікай Беларусь суверэнітэту, калі Мінск набыў статус сталіцы незалежнай краіны, значна ўзрасла цікаўнасць грамадства да пытанняў урбананіміі Мінска. Растлумачыць гэтую хвалю інтарэсу да тапаніміі горада можна не толькі яе слабой даследаванасцю ці сталічным статусам Мінска. Камфорт пражывання гараджан у Мінску складаецца ў тым ліку з ведаў пра горад і ягоную прастору. Школьнікі, студэнты, настаўнікі, краязнаўцы, журналісты і аматары гісторыі горада імкнуліся даведацца пра паходжанне назваў вуліц, плошчаў, мікрараёнаў, адказаць на пытанне, чаму тая ці іншая вуліца так называецца ці неаднаразова змяняла сваё найменне. Аднак гэты грамадскі запыт не быў задаволены з-за адсутнасці комплексных навуковых даследаванняў па дадзенай тэме.

З 1793 да 1991 г. Мінск прайшоў шлях ад невялікага губернскага горада Расійскай імперыі да сталіцы незалежнай Рэспублікі Беларусь. За гэты час колькасць насельніцтва ў Мінску вырасла ад 8 тысяч да амаль 1,6 мільёна чалавек, тэрыторыя павялічылася ў дзясяткі разоў, а колькасць вуліц і плошчаў – з 37 да 1200 (падлік наш – *І. С.*). На працягу гэтага перыяду сфарміравалася сучасная ўрбананімная сістэма горада, якая складаецца з назваў вуліц, завулкаў, плошчаў, паркаў, сквераў, пасёлкаў, мікрараёнаў, адміністратыўных раёнаў. На пэўных этапах у гэту сістэму ўваходзілі прадмесці, слабоды, урочышчы, фальваркі, рабочыя пасёлкі. Многія непаўторныя назвы спачатку з'явіліся на карце горада, потым былі зменены, а затым зніклі. Аднак вызначыць, якія фактары паўплывалі на гэтыя перамены, немагчыма без грунтоўнага даследавання сацыяльна-эканамічных, нацыянальна-рэлігійных і грамадска-палітычных умоў існавання ўрбананімнай прасторы Мінска.

Шлях да статусу сталіцы Беларусі ў Мінска быў складаным. У XIX ст. галоўным горадам беларускіх зямель прызнавалася Вільня. Але імклівая ўрбанізацыя Мінска ў канцы XIX – пачатку XX ст. і зручнае геаграфічнае становішча горада ў цэнтры Беларусі прывялі ў 1917–1918 гг. да вострых абмеркаванняў у грамадстве, які ж горад павінен стаць галоўным у Беларусі. У выніку Першай сусветнай вайны, рэвалюцыйных падзей 1917 г. і наступных палітычных перамен у 1919 г. статус сталіцы Савецкай Беларусі атрымаў Мінск. У 1939 г. пастановай Вярхоўнага Савета БССР назва горада

“Менск” афіцыйна змяняецца на “Мінск”. З 1991 г. горад стаў сталіцай суверэннай дзяржавы – Рэспубліцы Беларусь. Сталічны статус Мінска патрабуе адлюстравання ў найменнях вуліц, плошчаў і паркаў тысячагадовай гісторыі горада і краіны. Вуліцы і плошчы павінны называцца ў гонар найважнейшых гістарычных падзей і асобаў, якія зрабілі вялікі ўклад у гісторыю і культуру Беларусі. У гэтым Мінск павінен стаць прыкладам для астатніх гарадоў Рэспублікі Беларусь.

Навуковая актуальнасць даследавання ўрбананіміі Мінска абумоўліваецца неабходнасцю выкарыстання дысертацыйных матэрыялаў у дзейнасці Камісіі па найменаванні і перайменаванні вуліц і іншых састаўных частак горада пры Мінгарвыканкаме, членам якой аўтар з’яўляўся з 2003 да 2023 г. Дадзеная Камісія займаецца падборам назваў для новых вуліц і паркаў, мікрараёнаў і станцый метро, колькасць якіх з кожным годам павялічваецца. У сваёй дзейнасці Камісія абапіраецца на прынцып гістарычнасці, які патрабуе адраджэння страчаных гістарычных найменняў. Каб падабраць для новай вуліцы, парку ці станцыі метро гістарычную назву, неабходна не толькі ведаць гісторыю горада, але і дасканала валодаць пытаннямі ўрбананіміі Мінска, што вымагае папярэдняга сістэмнага навуковага даследавання ўрбананімнага ландшафту.

Сёння Мінскператварыўся ў вялікі турыстычны цэнтр, які наведваюць як беларускія, так і замежныя госці. Асноўную ўвагу турыстаў прыцягвае гістарычны цэнтр горада, які часткова захаваўся і адрэстаўрыраваны за апошнія гады. Захаваныя старыя назвы вуліц і прадмесцяў гістарычнага цэнтра – Верхні Горад, Замчышча, Зыбіцкая, Няміга, Ракаўская, Старавіленская, Траецкая Гара – ствараюць прывабнае для турыстаў асяроддзе і тым самым дапамагаюць рэалізаваць турыстычны патэнцыял Мінска. Аднак працэс вяртання першапачатковых назваў вуліцам гістарычнага цэнтра далёкі ад завяршэння. Да перайменаванняў у гістарычным цэнтры Мінска можна падыходзіць толькі на аснове глыбокага і ўсебаковага навуковага даследавання працэсу генезісу ўрбанонімаў.

Сапраўдны патрыятызм немагчыма ўявіць без любові да роднага горада, якая пачынаецца з ведаў пра родную вуліцу, мікраraён і раён. Родныя назвы дапамагаюць у фарміраванні нацыянальнай свядомасці і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей. Даследаванне і папулярызацыя тэмы ўрбананіміі Мінска будуць садзейнічаць патрыятычнаму выхаванню моладзі і ўсіх жыхароў горада.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне падрыхтавана ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» (тэрмін выканання 2006–2010 гг.), зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 512 ад 17 мая 2005 г., дзяржаўнай

праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» (2011–2015 гг.), прынятай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь 9 чэрвеня 2010 г. пастановай № 886, дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (2016–2020 гг.).

Тэма дысертацыйнага даследавання «Гісторыя Мінска: гарадская планіровачная структура і ўрбананімія (канец XVIII – XX ст.)» зацверджана на пасяджэнні Вучонага Савета Інстытута гісторыі НАН Беларусі (пратакол № 4 ад 21 сакавіка 2000 г.); удакладнена на пасяджэнні савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» ў наступнай фармулёўцы: «Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)» (пратакол № 1 ад 3 мая 2023 г.).

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэта* даследавання – выявіць асаблівасці фарміравання і трансфармацыі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ва ўмовах сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных змен у 1793–1991 гг. Для яе дасягнення пастаўлены наступныя *задачы*:

- выявіць спосабы фарміравання ўрбананімнага ландшафту Мінска ў 1793–1991 гг.;
- вылучыць і ахарактарызаваць этапы ў развіцці ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг.;
- прасачыць ступень уплыву сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага фактараў на ўрбананімію Мінска ў 1793–1991 гг.;
- вызначыць прынцыпы фарміравання ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг.

**Аб’ектам даследавання** з’яўляецца сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё Мінска ў 1793–1991 гг.

**Прадмет даследавання** – урбананімія Мінска, або сукупнасць назваў вуліц, плошчаў, завулкаў, праспектаў, бульвараў, праездаў, трактаў, прадмесцяў, слабод, урочышчаў, фальваркаў, вёсак, паркаў, сквераў, рабочых пасёлкаў, мікрараёнаў і адміністратыўных раёнаў горада ў 1793–1991 гг.

*Храналагічныя межы* дысертацыйнага даследавання ахопліваюць перыяд з 1793 г. па 1991 г. Ніжняя мяжа – другі падзел Рэчы Паспалітай і ўваход Міншчыны і Мінска ў склад Расійскай імперыі. Верхняя мяжа – спыненне існавання СССР як суб’екта міжнароднага права і стварэнне Рэспублікі Беларусь. Менавіта ў гэты перыяд, які ўключае ў сябе час знаходжання Мінска ў складзе Расійскай імперыі, час ваенных і палітычных змен 1917–1922 гг. і эпоху СССР, адбыліся працэсы развіцця і карэнных трансфармацый урбананімнай прасторы горада.

*Геаграфічныя межы* дысертацыйнага даследавання ахопліваюць тэрыторыю, якая суадносіцца з граніцамі Мінска па стане на 1991 г.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Урбананімія Мінска ў 1793–1991 гг. фарміравалася з дапамогай двух спосабаў: аўтаномнага і інстытуцыянальнага. Аўтаномны заключаўся ў

тым, што ўнутрыгарадскія назвы прысвойваліся самімі гараджанамі (грамадствам) і затым фіксаваліся ў пісьмовых крыніцах. Інстытуцыянальны спосаб заключаўся ў стварэнні ўрбанонімаў гарадскімі структурамі (дзяржавай), якія не толькі давалі гарадскому аб'екту новую назву, замацаваную дакументальна, але і кантралявалі яе далейшае існаванне праз інстытуцыянальныя магчымасці – дакументаабарот, усталяванне вулічных шыльдаў, прысваенне аб'ектам паштовых адрасоў.

2. Ва ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. у залежнасці ад дзяржаўнай прыналежнасці горада і дзяржаўнай палітыкі, а таксама спосабу фарміравання найменняў вылучаюцца 4 этапы: 1) 1793–1865 гг.; 2) 1866–1916 гг.; 3) 1917–1944 гг.; 4) 1945–1991 гг. На першым этапе (1793–1865 гг.) унутрыгарадскія назвы фарміраваліся з дапамогай аўтаномнага спосабу, калі грамадства давала найменні вуліцам і плошчам, а дзяржава ў гэты працэс не ўмешвалася. Другі этап (1866–1916 гг.) характарызаваўся панаваннем аўтаномнага і з'яўленнем інстытуцыянальнага спосабу, калі гараджане па-ранейшаму стваралі ўрбанонімы, а дзяржава спрабавала ў асобных выпадках карэкціраваць гэты працэс. Характэрнымі рысамі трэцяга этапу (1917–1944 гг.) былі адыход ад аўтаномнага спосабу і ўдасканаленне інстытуцыянальнага, калі ініцыятыва ў фарміраванні ўрбананіміі Мінска перайшла ад грамадства да дзяржавы. На гэтым этапе паступова фарміраваўся эфектыўны механізм кантролю дзяржавы над унутрыгарадскімі назвамі. На чацвёртым этапе (1945–1991 гг.) панаваў інстытуцыянальны спосаб фарміравання ўрбананімнага ландшафту, калі дзяржава татальна кантралявала большую частку ўрбананіміі Мінска.

3. Унутрыгарадскія назвы Мінска фарміраваліся ў 1793–1991 гг. пад уплывам сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця. Найменні вуліц, прадмесцяў і ўрочышчаў адлюстроўвалі нацыянальна-рэлігійныя, эканамічныя, прыродныя асаблівасці горада. Адмена прыгону ў 1861 г., развіццё капіталістычных адносін і ўрбанізацыя прывялі да колькасных і якасных змен ва ўрбананіміі Мінска ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аднак найважнейшае значэнне ў фарміраванні і трансфармацыі ўрбананіміі Мінска мелі грамадска-палітычныя падзеі (паўстанні, войны, рэвалюцыі) і змены дзяржаўнай палітыкі. Рэакцыя Расійскай імперыі на паўстанне 1863–1864 гг. прывяла да першага ў гісторыі Мінска масавага перайменавання вуліц і плошчаў. У 1917–1922 гг. у працэсе ўсталявання савецкай улады адбылася карэнная трансфармацыя ўрбананімнай сістэмы Мінска. Новыя ўрбанонімы з'яўляліся ў рэчышчы асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця БССР і адлюстроўвалі многія працэсы, якія адбываліся ў той час: НЭП, беларусізацыю, індустрыялізацыю, калектывізацыю. У час польскай (1919–1920 гг.) і нямецка-фашысцкай (1941–1944 гг.) акупацый Мінска былі зроблены няўдалыя спробы радыкальнай змены ўнутрыгарадскіх назваў. У тапанімічным ландшафце Мінска былі адлюстраваны асаблівасці сацыялістычнага будаўніцтва БССР у 1945–1991 гг.

4. У 1793–1991 гг. пры найменаванні ўнутрыгарадскіх аб’ектаў прымянялася некалькі прынцыпаў. У канцы XVIII – XIX ст. традыцыйнымі былі прынцыпы: этна-рэлігійны (найменні ўказвалі на культавыя ўстановы розных веравызнанняў і месцы рассялення народнасцей), тапаграфічны (унутрыгарадскія назвы адлюстроўвалі асаблівасці ландшафту і мясцовую тапаграфію), геаграфічны (калі ўрбанонімы фарміраваліся па геаграфічных аб’ектах: гарадах, мястэчках, рэках, вёсках). У XIX ст. з’явіліся новыя прынцыпы: прафесійны (урбанонімы ўказвалі на заняткі і прафесіі мінчан), геданімічны (найменні, якія былі прыгожымі па форме, але нічога не значылі па сутнасці), патранімічны (прадугледжваў найменаванне аб’екта па імені або прозвішчы чалавека). З 1920-х гг. патранімічны прынцып стаў дамінуючым у сталіцы савецкай Беларусі. У яго рамках можна выдзеліць найменні ў гонар: 1) дзеячаў камуністычнай партыі, савецкай дзяржавы і міжнароднага камуністычнага руху; 2) герояў грамадзянскай вайны, знакамітых паэтаў, пісьменнікаў, вучоных, лётчыкаў СССР 1920–1930-х гг.; 3) салдат і афіцэраў Савецкай арміі – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны; 4) партызан і падпольшчыкаў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны; 5) дзеячаў расійскай гісторыі і культуры; 6) дзеячаў беларускай гісторыі і культуры. У эпоху СССР з’явіўся сімвалічны прынцып (назвы адпавядалі ідэалогіі, якая праводзілася ў дзяржаве).

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Дысертацыйнае даследаванне з’яўляецца вынікам самастойнай працы аўтара. Пры падрыхтоўцы дысертацыі быў выяўлены, апрацаваны і прааналізаваны вялікі масіў архіўных крыніц, большая частка з якіх упершыню ўведзена ў навуковы абарот. Усе навуковыя публікацыі падрыхтаваны саіскальнікам асабіста. Навуковыя палажэнні і высновы дысертацыі распрацаваны аўтарам самастойна і прайшлі апрабацыю на 18 міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях. З 2003 да 2023 г. аўтар з’яўляўся членам Камісіі па найменаванні і перайменаванні вуліц і іншых састаўных частак горада пры Мінгарвыканкаме, на пасяджэннях якой неаднаразова прымаліся рашэнні па адраджэнні забытых гарадскіх найменняў, зафіксаваных у даследаванні.

**Навуковая навізна даследавання.** Дадзеная работа з’яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі спецыяльным комплексным даследаваннем унутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг. Упершыню на падставе шырокага кола крыніц сістэмна аналізуецца працэс генезісу ўнутрыгарадскіх найменняў Мінска і паказваецца сувязь паміж урбанонімамі і сацыяльна-эканамічным, рэлігійным і палітычным развіццём Беларусі. Устаноўлены спосабы і этапы фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. Вызначаны найважнейшыя фактары фарміравання ўнутрыгарадскіх назваў у 1793–1991 гг. Раскрываюцца прычыны карэнных перамен ва ўрбананімным ландшафце Мінска ў дадзены перыяд. Вызначана колькасць вуліц і прадмесцяў Мінска і яе змяненні ў даследуемы перыяд. Складзены табліцы масавых перайменаванняў, прасочаны змены назваў найважнейшых гарадскіх вуліц ад 1793 да 1991 г. Прааналізаваны суадносіны паміж

патранімічнымі і непатранімічнымі назвамі вуліц і вызначана іх структура. Выяўлены асноўныя прынцыпы фарміравання ўрбанонімаў у 1793–1991 гг. Адноўлены і лакалізаваны дзясяткі страчаных у апошнія дзесяцігоддзі найменняў. Створана аснова для адраджэння забытых назваў (у выглядзе корпуса назваў вуліц, плошчаў, мікрараёнаў, паркаў, станцый метро) на сучасным этапе развіцця горада.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.** Асноўныя палажэнні дысертацыі прайшлі апрабацыю на навуковай канферэнцыі "Этнічныя супольнасці Беларусі: гісторыя і сучаснасць" (6–7.12.2001 г., РБ, г. Мінск); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Современные проблемы школьного и вузовского географического образования и топонимических исследований" (27–30.12.2001 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры" (17–18.04.2003 г., РБ, г. Брэст); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Современные стратегии развития мегаполисов и крупных городов" (9–10.10.2003 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Стратегическое планирование и управление развитием городов" (7–8.10.2004 г., РБ, г. Минск); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры" (3.11.2006 г., РБ, г. Гродна); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада)" (7–9.09.2007 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Мінск і мінчане: 10 стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права)" (4–5.09.2009 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць" (15–16.09.2011 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Мінск і мінчане: 10 стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада (да 945-годдзя Мінска)" (6–7.09.2012 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Беларусь: памятное лето 1944 года (к 70-летию освобождения от немецко-фашистских захватчиков)" (19–20.06.2014 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі" (24–25.09.2015 г., РБ, г. Мінск); X Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. Мінск і Міншчына пасля падзей 1921 года – лёсы людзей і краіны" (13–14.09.2016 г., РБ, г. Мінск); навукова-практычнай канферэнцыі "Центральный район – история и современность" (30.05.2019 г., РБ, г. Минск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Рыжскі мір 1921 года ў лёсе беларускага народа (да 100-годдзя заключэння)" (18–19.03.2021 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Патрыятычнае выхаванне і захаванне гістарычнай памяці ў сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі: сучасны стан і перспектывы" (12–13.04.2022 г., РБ, г. Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 955-годдзя

горада)” (9–10.09.2022 г., РБ, г. Мінск); V Міжнародным кангрэсе гісторыкаў Беларусі “Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 95-годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)” (15–16.10.2024 г., РБ, г. Мінск).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання прадстаўлены ў 44 публікацыях, сярод якіх 8 артыкулаў у навуковых часопісах і зборніках, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь, 36 – у іншых навуковых зборніках і матэрыялах канферэнцый. Агульны аб’ём апублікаваных прац складае 16 друкаваных аркушаў.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Мэта і задачы дысертацыі вызначылі яе ўнутраную структуру. Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў: “Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання”, “Стан унутрыгарадскіх назваў у 1793–1916 гг.”, “Фіксацыя рэвалюцыйных і ваенных падзей, вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва ва ўнутрыгарадскіх назвах Мінска ў 1917–1944 гг.”, “Унутрыгарадскія назвы Мінска ў 1945–1991 гг.”, заключэння, дадаткаў і бібліяграфічнага спіса. Агульны аб’ём дысертацыі складае 172 старонкі, тэкст дысертацыі – 113 старонак. Бібліяграфічны спіс дысертацыйнага даследавання ўтрымлівае 450 пазіцый, з якіх 44 – публікацыі аўтара (разам 27 старонак).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

У раздзеле 1.1 **“Гістарыяграфія”** першай главы **“Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання”** прааналізаваны масіў выкарыстаных навуковых даследаванняў. Унутрыгарадскія назвы Мінска ў 1793–1991 гг. дагэтуль не з’яўляліся прадметам спецыяльнага гістарычнага даследавання, хоць гісторыя ўрбанонімаў шэрагу гарадоў Беларусі і постсавецкай прасторы знайшла сваіх сталых даследчыкаў. Асобныя аспекты дадзенай праблемы закраналіся даследчыкамі гісторыі, архітэктуры, культуры Мінска, а гістарычны аспект урбананімнага ландшафту горада неаднаразова станавіўся аб’ектам вывучэння географаў і філолагаў, якія, працуючы над вырашэннем сваіх навуковых задач, вымушаны былі выходзіць за межы геаграфіі і анамастыкі і адказваць на гістарычныя пытанні.

У гістарыяграфіі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг. можна выдзеліць асобныя храналагічныя этапы. Першы супадае з часам знаходжання тэрыторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (сярэдзіна XIX – пачатак XX ст.) і вызначаецца зараджэннем горадазнаўства, апісальнай метадалогіяй у дачыненні да ўнутрыгарадскіх назваў. Гарадскія вуліцы, плошчы і прадмесці ўзгадваліся ў работах П. Шпілеўскага[1], У. Сыракомлі[2],

[1] Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский; предисл., текстол. подгот., прим. и коммент. С. А. Кузняевой. – Минск : Беларусь, 2004. – 251 с.

[2] Сыракомля, У. Выбраныя творы / Уладзіслаў Сыракомля; уклад., прадм., камент. К. Цвіркі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 580 с.

А. Ельскага[3]. Усе вышэйзгаданыя даследаванні толькі фрагментарна закранаюць урбананімны ландшафт Мінска, даследаванне тапонімаў у іх з'яўляецца другаснай задачай. Другі этап супаў з нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтвам у Беларусі (1918 – канец 1920-х гг.) і характарызаваўся актывізацыяй краязнаўчага руху ў БССР, з'яўленнем шэрага работ з урбананімным зместам[4]. Аўтары гэтых даследаванняў хоць і рабілі акцэнт на палітычным і эканамічным развіцці горада, але разам з тым фіксавалі ўнутрыгарадскія назвы[5]. Трэці этап гістарыяграфіі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг. прыходзіцца на 1950–1970-я гг. і характарызуецца супярэчлівымі тэндэнцыямі. З аднаго боку, у гэты час з'яўляюцца даследаванні па археалогіі[6], гісторыі[7], тапаніміцы[8], у якіх фрагментарна закранаюцца пытанні ўнутрыгарадскіх назваў Мінска. З другога боку, у тагачасных гістарычных даследаваннях пра Мінск амаль поўнасцю ігнаруецца тапанімічны кантэнт, адсутнічае краязнаўчая плынь у гістарыяграфіі, па ідэалагічных прычынах замоўчваюцца асобныя тэмы гарадской тапаніміі. Работа В. А. Жучкевіча "Улицы помнят: история, события, люди в названиях улиц и площадей города-героя Минска" з'яўляецца першым даследаваннем урбанонімаў Мінска, выдадзеным асобнай кнігай. У ёй аўтар падзяліў вулічныя назвы на сэнсавыя групы, прасачыў сувязь найменняў з сацыяльна-эканамічным развіццём горада, нацыянальным і рэлігійным асяроддзем, заклікаў да беражлівага стаўлення да гістарычных назваў[9]. Чацвёрты этап (1980–1989 гг.) амаль супадае з апошнім дзесяцігоддзем існавання СССР і вызначаецца значным ростам публікацый і навуковых даследаванняў пра Мінск. Штуршком да перамен у гістарыяграфіі ўрбананіміі Мінска ў 1980-я гг. стаў выхад энцыклапедычнага даведніка "Минск" (1980), які насычаны тэкстамі пра вуліцы, плошчы, прадмесці, мікрараёны і вёскі, што ўвайшлі ў склад Мінска[10]. У выданні У. М. Дзянісава "Площадь Свободы в Минске" (1985), нягледзячы на мастацкую скіраванасць кнігі, для абазначэння архітэктурных помнікаў побач з сучаснымі аўтар выкарыстаў гістарычныя назвы[11]. Пяты, сучасны этап гістарыяграфіі гарадской тапаніміі Мінска ахоплівае перыяд ад 1990 г. і

---

[3] Ельскі, А. Выбранае / Аляксандр Ельскі; уклад. Н. Мазоўка, У. Казберука; прадм. У. Казберука, К. Цвіркі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 493 с.

[4] Даўгяла, Зм. Стары Менск (Нарыс з гісторыі замку і эканамічнага жыцця места) / Зм. Даўгяла // Наш край. – 1928. – № 1. – С. 12; Друшчыц, В. Места Менск у канцы XV і пачатку XVI ст. / В. Друшчыц // Працы БДУ. – 1926. – № 12. – С. 12–22.

[5] Смоліч, А. Географія Беларусі / А. Смоліч; паслясл. А. Ліса. – 4-е выд. – Менск : Беларусь, 1993. – 374 с.

[6] Тарасенко, В. Р. Итоги раскопок минского замчища в 1945–1948 гг. / В. Р. Тарасенко // Изв. Акад. наук Белорус. ССР. – 1950 – № 4. – С. 69–95.

[7] Гісторыя Мінска / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: Н. В. Каменская [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 686 с.

[8] Палеес, С. З гісторыі назваў мінскіх вуліц / С. Палеес // Беларусь. – 1958. – № 5. – С. 63.

[9] Жучкевич, В. А. Улицы помнят: история, события, люди в названиях улиц и площадей города-героя Минска / В. А. Жучкевич. – Минск : Беларусь, 1979. – С. 19.

[10] Минск : энцикл. справ. / Гл. ред. Бел. Совет. Энцикл. ; редкол.: П. У. Бровка (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Гл. ред. Бел. Совет. Энцикл., 1980. – 424 с.

[11] Денисов, В. Н. Площадь Свободы в Минске / В. Н. Денисов. – Минск : Полымя, 1985. – 79 с.

да нашага часу і характарызуецца інтэнсіфікацыяй публіцыстычных і навуковых даследаванняў, у тым ліку прысвечаных урбананіміі Мінска. У гэты час выйшла значная колькасць навуковай, спецыялізаванай, краязнаўчай, публіцыстычнай, мемуарнай і даведачнай літаратуры пра горад Мінск, дзе ўтрымліваецца шмат інфармацыі тапанімічнага зместу. Найважнейшае месца ў гістарыяграфіі ўрбананіміі Мінска займае кніга "Мінск. Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада" (аўтары – З. В. Шыбека і С. Ф. Шыбека), з якой фактычна і пачаўся гэты этап[12]. У выданні не толькі фігуруюць старыя гарадскія адрасы, пералічваюцца асноўныя вуліцы, прадмесці, але і ўпершыню публікуецца даведачная табліца вуліц і плошчаў горада ў пачатку XX ст. з лакалізацыяй іх па сучасных арыенцірах. Г. М. Мезенка ў кнізе "Урбанонимия Белоруссии" (1991) сфармулявала тэрміналагічны апарат для раздзела анамастыкі, які даследуе ўнутрыгарадскія найменні[13].

Гістарыяграфічны аналіз усіх пяці этапаў паказвае, што вышэйпералічаныя работы змяшчаюць вялікі факталагічны матэрыял па гісторыі ўрбананіміі Мінска 1793–1991 гг., але не даюць цэласнага і сістэмнага ўяўлення пра структуру і змены ва ўрбананімным ландшафце горада. Для абсалютнай большасці гэтых даследаванняў уласціва адсутнасць комплекснага падыходу да вывучэння этымалогіі найменняў, іх лакалізацыі па сучасных арыенцірах, прычын перайменаванняў аб'ектаў і знікненняў назваў, іх сувязей з сацыяльна-эканамічным, палітычным, тапаграфічным, нацыянальным і рэлігійным развіццём Мінска.

У раздзеле 1.2 "**Крыніцы**" даецца характарыстыка крыніц дысертацыйнага даследавання. Для аналізу выкарыстаны матэрыялы, якія знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (г. Мінск), Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (г. Мінск), Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці (г. Мінск), Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі (г. Мінск), Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (г. Мінск), Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь (г. Мінск). Сфарміраваны комплекс з апублікаваных і архіўных крыніц (справаводчых, статыстычных, картаграфічных, перыядычных, мемуарнай літаратуры).

*Матэрыялы справаводства* дзяржаўных устаноў Расійскай імперыі і СССР характарызуюцца разнастайнасцю і неаднароднасцю. Большасць крыніц па тапаніміцы Мінска знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ). Матэрыялы па ўрбананіміі Мінска XIX – пачатку XX ст. захоўваюцца ў розных фондах архіва: ф.1 (Мінская гарадская ўправа), ф.18 (Мінская гарадская камісія), ф.24 (Мінская гарадская дума), ф.149 (Мінскі гарадавы магістрат), ф.295 (Канцылярыя Мінскага

---

[12] Шыбека, З. В., Шыбека, С. Ф. Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З. В. Шыбека, С. Ф. Шыбека ; пер. з рус. мовы М. Віжа; прадм. С. М. Станюты. – Мінск : Полымя, 1994. – 341 с.

[13] Мезенко, А. М. Урбанонимия Белоруссии / А. М. Мезенко ; под ред. П. П. Шубы. – Минск : Университетское, 1991. – 165 с.

грамадзянскага губернатара), ф.333 (Мінская казённая палата), ф.446 (Мінская губернская будаўнічая камісія). Але найбольшая колькасць спраў, карысных для даследавання тапанімікі Мінска, знаходзіцца ў фондах гарадской управы (ф.1) і гарадской думы (ф.24).

Вялікі пласт тапанімічных крыніц знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці (ДАМВ). Матэрыялы, якія змяшчаюць інфармацыю пра ўрбананімію Мінска з 1918 да пачатку 1970-х гг., знаходзяцца ў ф.3 (выканкам Мінскага Акрсавета) і ф.6 (выканкам Мінгарсавета). Яны складаюцца са спісаў вуліц г. Мінска, пратаколаў пасяджэнняў Мінгарсавета, звестак пра населеныя пункты гарадской рысы, спісаў домаўладальнікаў па вуліцах, упамінанняў пра розныя інфраструктурныя аб’екты горада. Матэрыялы па гісторыі ўрбананіміі Мінска 1918–1960-х гг. прысутнічаюць таксама ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Вялікую дапамогу ў вывучэнні колькасці гарадскіх тапонімаў аказваюць разнастайныя *статыстычна-даведачныя выданні*. Сярод іх неабходна назваць “Памятные книжки Минской губернии” і даведнікі, у якіх прысутнічае спіс гарадскіх плошчаў і вуліц Мінска. Важнымі крыніцамі для даследчыка тапаніміі Мінска з’яўляюцца *картаграфічныя матэрыялы* – карты і планы горада з пазначанымі на іх назвамі вуліц і прадмесцяў. Яны дапамагаюць лакалізаваць асобныя гарадскія аб’екты, акрэсліць іх памеры і час існавання. Найбольшая колькасць карт Мінска на сёння захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД). Амаль усе яны сканцэнтраваны ў ф.6 (Планы гарадоў). Велізарная колькасць тапанімічнай інфармацыі знаходзіцца ў *перыядычных выданнях*, найперш газетах. Падводзячы вынікі агляду крыніц па тапаніміцы Мінска 1793–1991 гг., заўважым, што сукупнасць крыніц па ўнутрыгарадскіх назвах Мінска з’яўляецца разнастайнай і рэпрэзентатыўнай па сваёй сутнасці.

У раздзеле 1.3 “**Метады даследавання**” акрэслена тэарэтыка-метадалагічная аснова даследавання. Метадалагічную базу дысертацыі склалі прынцыпы аб’ектыўнасці, гістарызму і прынцып каштоўнасці ў гісторыі. Для дасягнення пастаўленых задач і мэты даследавання былі выкарыстаны агульнанавуковыя (абагульненне, аналіз, аналогія, сінтэз, параўнанне) і спецыяльныя гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, рэтраспектыўны). Міждысцыплінарны характар даследавання абумовіў зварот да тэрміналагічнага апарату анамастыкі, які быў шырока выкарыстаны пры вывучэнні транфармацыі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска. Па гэтай жа прычыне выкарыстоўваўся паняційны апарат картаграфіі пры аналізе вялікай колькасці карт, што дазволіла лакалізаваць многія старыя ўнутрыгарадскія найменні.

У другой главе **“Стан унутрыгарадскіх назваў у 1793–1916 гг.”** аналізуецца ўрбананімная сітуацыя ў перыяд знаходжання Мінска ў складзе Расійскай імперыі, высвятляюцца асноўныя характэрныя рысы і фактары, якія ўплывалі на ўрбананімны ландшафт горада. У раздзеле 2.1 **“Фактары фарміравання назваў вуліц і плошчаў”** вызначаюцца найменні вуліц і

плошчаў, якія існавалі ў той перыяд. Падкрэсліваецца, што пасля 1793 г. назвы вуліц горада не змяніліся. У канцы XVIII – пач. XIX ст. у Мінску захоўвалася тапаніміка папярэдняга перыяду, якая з'явілася ў эпоху Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Назвы вуліцам давалі самі мінчане, і затым урбанонімы ўказваліся на старонках дакументаў. Дзяржава ў гэты працэс не ўмешвалася: ніводнага дакумента аб найменаванні або перайменаванні аўтарам не было выяўлена. Перыяд 1793–1916 гг. ва ўрбананіміі Мінска ў залежнасці ад спосабу яе фарміравання і дзяржаўнай палітыкі можна падзяліць на 2 этапы. Першы (1793–1865) можна ахарактарызаваць існаваннем аўтаномнага спосабу фарміравання ўрбананіміі Мінска і адсутнасцю дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы. На другім этапе (1866–1916) пачаў складвацца інстытуцыянальны спосаб фарміравання ўнутрыгарадскіх найменняў. Яго найважнейшай рысай стала імкненне мясцовых органаў улады ўмяшацца ў фарміраванне ўрбананімнага ландшафту па палітычных прычынах праз дакументальна зафіксаваныя перайменаванні. Пачаткам этапу можна лічыць масавае перайменаванне вуліц і плошчаў горада ў 1866 г. Пры гэтым разам з інстытуцыянальным існаваў і аўтаномны спосаб, калі назвы вуліцам прысвойваліся грамадствам, існавалі іх варыятыўнасць і зменлівасць. На фарміраванне ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. уплывалі этна-рэлігійны, прыродны, грамадска-палітычны і сацыяльна-эканамічны фактары.

У раздзеле 2.2 **"Умовы з'яўлення найменняў прадмесцяў, слабод, урочышчаў і фальваркаў"** разглядаюцца назвы тэрытарыяльных аб'ектаў – прадмесцяў, слабод, урочышчаў і фальваркаў. На працягу XIX – пач. XX ст. у выніку ўрбанізацыі значна пашырылася плошча гарадской забудовы. Асобныя мясцовасці ў горадзе ў межах квартальнай забудовы звычайна называлі прадмесцямі ці слабодамі, а ў наваколлі на свабоднай ад забудовы гарадской тэрыторыі – урочышчамі і фальваркамі. І калі ў пач. XIX ст. налічвалася толькі 4 прадмесці (Лавы, Новае Места, Ракаўскае і Траецкая Гара) і 3 слабады (Ляхаўская, Раманаўская, Старосцінская), то ў пач. XX ст. іх разам стала 21. Мінску былі патрэбны рабочыя рукі на фабрыках і заводах, таму на працягу XIX ст. імкліва расла колькасць слабод і прадмесцяў. Блізкасць паняццяў "слабада" і "прадмесце" падкрэсліваецца тым фактам, што некаторыя слабоды з цягам часу, па меры забудовы навакольнай тэрыторыі, пачалі называць прадмесцямі. А былыя фальваркі і ўрочышчы, трапіўшы ў межы гарадской забудовы, з цягам часу ператвараліся ў слабоды і прадмесці.

У трэцяй главе **"Фіксацыя рэвалюцыйных і ваенных падзей, вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва ва ўнутрыгарадскіх назвах Мінска ў 1917–1944 гг."** даецца аналіз тапанімічнай сітуацыі, якая склалася ў 1917–1944 гг. Раздзел 3.1 **"Перайменаванне вуліц і плошчаў у 1917–1922 гг."** прысвечаны аналізу кардынальных пераменаў, якія адбыліся ва ўрбананімным ландшафце Мінска ў 1917–1922 гг., калі ўлады пачалі разглядаць назвы вуліц і плошчаў у якасці ідэалагічнага сродку ўздзеяння на

насельніцтва. Вырашальным фактарам усіх перайменаванняў у Мінску ў 1917–1922 гг. была змена палітычнай улады. Урбананімія Мінска змянілася ў гэты час кардынальна, бо пад перайменаванне падпалі самыя важныя і вялікія вуліцы ў цэнтральнай частцы горада. І пачатак гэтаму працэсу быў закладзены менавіта падзеямі 1917–1922 гадоў, калі органы ўлады сталі разглядаць назвы вуліц і плошчаў як аб’ект дзяржаўнай ідэалогіі. Менавіта ў 1920-я гг. аформілася працэдура найменавання і перайменавання ўнутрыгарадскіх аб’ектаў Мінска праз рашэнне мясцовага органа ўлады, што фіксавалася пратаколамі. Масава сталі называць вуліцы ў гонар канкрэтных асоб, тым самым заклаўшы асновы для новай практыкі: дагэтуль патранімічныя найменні сустракаліся толькі ў якасці выключэння. Першымі паспрабавалі змяніць урбананімію Мінска савецкія ўлады ў 1919 г. Польскія акупацыйныя ўлады ў тым жа 1919 г. таксама перайменавалі вуліцы Мінска. Вырашальным аказалася савецкае перайменаванне вуліц і плошчаў горада ў 1922 г. Менавіта яно было рэалізавана і захавалася да сённяшняга дня.

У раздзеле 3.2 **“Адлюстраванне грамадска-палітычных змен у назвах вуліц і плошчаў у 1923–1944 гг.”** вызначаны асноўныя рысы фарміравання найменняў вуліц і плошчаў Мінска. Новыя найменні часцей за ўсё прысвойваліся па патранімічным і сімвалічным прынцыпах, яны праслаўлялі камуністычных дзеячаў, прапагандавалі савецкія святы і стваралі вобраз сацыялістычнага горада. Знайшлі сваё адлюстраванне на вулічных шыльдах сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя перамены, якія адбываліся ў БССР: беларусізацыя, індустрыялізацыя, змаганне з рэлігіяй, інтэрнацыяналізацыя. Найважнейшым фактарам фарміравання назваў вуліц і плошчаў Мінска стаў грамадска-палітычны, калі найменні знаходзіліся ў рэчышчы дзяржаўнай ідэалогіі. Новыя назвы не толькі фіксаваліся юрыдычна, але ствaралася працэдура адміністратыўнага кантролю за выкананнем прынятага рашэння аб перайменаванні або найменаванні. Нямецка-фашысцкая акупацыя горада 1941–1944 гг. не змяніла гэтую тэндэнцыю, а толькі перапыніла развіццё савецкай тапанімікі горада на 3 гады. Нягледзячы на ўсе спробы перайменаванняў, акупантам не ўдалося ўкараніць новую тапанімічную сістэму ў свядомасць мінчан. Час нямецка-фашысцкай акупацыі для ўрбананіміі Мінска характарызаваўся суіснаваннем старых і новых назваў у дакументах і на старонках газет, пераважным панаваннем даваенных назваў у побыце, хуткім знікненнем новых найменняў пасля адыходу нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У раздзеле 3.3 “**Сацыялістычнае будаўніцтва і назвы прадмесцяў, слабод, урочышчаў, рабочых пасёлкаў, зялёных масіваў і раёнаў**” разглядающца асаблівасці фарміравання і змен у 1917–1944 гг. харонімаў Мінска, якія заставаліся важнай часткай урбанонімнай прасторы. Яны не падвергліся масавым зменам, як гэта адбылося з назвамі вуліц і плошчаў. Большая частка прадмесцяў і ўрочышчаў папярэдняга перыяду працягвала існаваць і ў гэты час. У 1920-я гг. з’явіліся новыя аб’екты для харонімаў – рабочыя пасёлкі, якія паступова выціснулі з ужывання папярэдні тэрмін

“прадмесце”. Новыя харонімы ў 1920-я гг. (час НЭПа і беларусізацыі) падкрэслівалі камуністычную ідэалогію, мясцовую тапаграфію, развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі. У 1917–1944 гг. інстытуцыянальны спосаб фарміравання ўрбананімнай прасторы Мінска, які дамінаваў у стварэнні назваў вуліц і плошчаў, у дачыненні да харонімаў паказаў нізкую эфектыўнасць, за выключэннем найменняў адміністратыўных раёнаў.

У чацвёртай главе “**Унутрыгарадскія назвы Мінска ў 1944–1991 гг.**” адлюстравана фарміраванне ўрбананімікону Мінска ў 1944–1991 гг. У раздзеле 4.1 **“Найменні гарадскіх вуліц і плошчаў ва ўмовах урбанізацыі”** даецца аналіз назваў вуліц і плошчаў Мінска ў перыяд, які характарызуецца рэзкім ростам колькасці ўрбанонімаў. Найважнейшым фактарам фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1945–1991 гг. было грамадска-палітычнае жыццё. Памяць пра Вялікую Айчынную вайну, якая была галоўнай тэмай у грамадстве, прысутнічала і ў назвах вуліц і плошчаў. Найменні вуліц горада перажылі сваю “хрушчоўскую адлігу”, калі ў тапонімах былі ўвекавечаны імёны мінскіх падпольшчыкаў. Урбанонімы разам з грамадствам развянчалі культ асобы І. Сталіна ў 1961 г., калі галоўная траса Мінска праспект Сталіна стаў Ленінскім. Падчас правядзення палітыкі перабудовы ўпершыню ў гісторыі Мінска была створана камісія па найменаванні гарадскіх вуліц, а першым вуліцам вярнулі іх гістарычныя назвы. Разам з распадам СССР плошча Леніна і праспект Ленінскі змяніліся, адпаведна, на плошчу Незалежнасці і праспект Скарыны. На вулічных шыльдах Мінска ў 1945–1991 гг. былі ўшанаваны дзеячы расійскай гісторыі і культуры, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны – салдаты і афіцэры Савецкай арміі, партызаны і падпольшчыкі, ўдзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны, члены камуністычнай партыі, дзеячы беларускай гісторыі і культуры.

У раздзеле 4.2 **“Назвы рабочых пасёлкаў, мікрараёнаў, зялёных масіваў, былых вёсак і раёнаў у час актыўнага будаўніцтва і пашырэння адміністратыўных граніц”** аналізуюцца змены ў назвах раёнаў, вёсак, уключаных у межы горада, рабочых пасёлкаў, мікрараёнаў і зялёных масіваў, якія ў 1944–1991 гг. сталі неад’емнай часткай сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця горада. Колькасць адміністратыўных раёнаў за гэты перыяд вырасла з 3 да 9. Урбанізацыя дасягнула высокіх тэмпаў, вёскі і пасёлкі, трапляючы ў межы Мінска, у большасці гублялі сваю ідэнтычнасць, і толькі некаторым адкрывалася перспектыва другога жыцця ў назве новага мікрараёна. Найменні рабочых пасёлкаў адлюстроўвалі асноўны напрамак пасляваеннай эканомікі БССР – імклівае развіццё прамысловасці. Назвы новых мікрараёнаў разрывалі сувязі з мінулым, каб быць зразумелымі для сотняў тысяч новых мінчан. Найменні паркаў станавіліся гімнам савецкай ідэалогіі. Назвы тэрытарыяльных аб’ектаў Мінска ў гэты час станавіліся дакладным адлюстраваннем тых палітычных, сацыяльных, культурных, эканамічных змен, якія перажывала ўсё грамадства. Пры гэтым большасць з іх, акрамя назваў паркаў і адміністратыўных раёнаў, аказаліся па-за межамі прававога поля.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі:

1. Фарміраванне ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг. адбывалася праз аўтаномны і інстытуцыянальны спосабы. Сутнасць аўтаномнага была ў тым, што ўнутрыгарадскія назвы стыхійна прысвойваліся самімі гараджанамі (грамадствам), пасля чаго фіксаваліся ў пісьмовых крыніцах. Мінчане карысталіся тымі найменнямі, якія былі для іх зручнымі і дапамагалі ў паўсядзённым жыцці. Яны ўкараняліся ў свядомасці, траплялі на старонкі дакументаў, газет, паштовых адпраўленняў. Характэрнымі рысамі аўтаномнага спосабу з'яўлення найменняў былі: варыятыўнасць, калі адначасова існавала некалькі назваў у аднаго і таго ж аб'екта; зменлівасць, калі многія назвы часта змяняліся. У канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. яшчэ адной асаблівасцю аўтаномнага спосабу стала існаванне безыменных унутрыгарадскіх аб'ектаў і дубліраваных найменняў. Інстытуцыянальны спосаб заключаўся ў стварэнні ўрбанонімаў гарадскімі структурамі (дзяржавай), якія давалі гарадскому аб'екту юрыдычна замацаваную новую назву. Акрамя таго, дзяржава выпрацоўвала працэдуру па кантролі за выкананнем гэтых рашэнняў і далейшым існаваннем назвы праз інстытуцыянальныя магчымасці – дакументаабарот, усталяванне вулічных шыльдаў, паштовыя зносіны, сродкі масавай інфармацыі. Найважнейшай прыкметай устойлівасці інстытуцыянальнага спосабу з'яўляецца адсутнасць безыменных аб'ектаў і дубліраваных унутрыгарадскіх назваў [5; 6; 7; 8; 11; 12; 16; 25; 35; 38].

2. Ва ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. у залежнасці ад змен дзяржаўнай прыналежнасці горада і дзяржаўнай палітыкі, а таксама спосабу фарміравання ўрбананімнай прасторы вылучаюцца 4 этапы: 1) 1793–1865 гг.; 2) 1866–1916 гг.; 3) 1917–1944 гг.; 4) 1945–1991 гг. На першым этапе (1793–1865 гг.) пасля далучэння цэнтральнай часткі беларускіх зямель да Расійскай імперыі ўнутрыгарадскія назвы фарміраваліся з дапамогай аўтаномнага спосабу, калі само грамадства стыхійна давала найменні вуліцам, плошчам, урочышчам, прадмесцям. Нават такія назвы, як вуліца Аляксандраўская, Захараўская, Мікалаеўская, былі дадзены гараджанамі, а не ўладамі. Расійскія ўлады не разглядалі ўнутрыгарадскія назвы як аб'ект дзяржаўнай палітыкі. Другі этап (1866–1916 гг.) характарызаваўся панаваннем аўтаномнага і з'яўленнем інстытуцыянальнага спосабу. З аднаго боку, гараджане па-ранейшаму самі давалі назвы аб'ектам, а часам і змянялі іх. З другога боку, дзяржава кропкава спрабавала карэкціраваць гэты працэс праз прыняцце дакументальных рашэнняў аб змене назваў вуліц і плошчаў. Першы вядомы прыклад – перайменаванне вуліц і плошчаў Мінска ў 1866 г. Далей быў перайменаваны яшчэ шэраг вуліц горада, але з-за адсутнасці распрацаванай працэдуры кантролю за выкананнем рашэння многія змены не былі рэалізаваны. Назвы новых вуліц юрыдычна не замацоўваліся. На гэтым этапе дзяржава не выпрацавала паслядоўную палітыку ў дачыненні да

ўрбананімнай прасторы. Характэрнымі рысамі трэцяга этапу (1917–1944 гг.) былі адыход ад аўтаномнага спосабу і ўдасканаленне інстытуцыянальнага. Частыя змены дзяржаўнай прыналежнасці ў адзначаны перыяд паўплывалі на пераўтварэнне ўнутрыгарадскіх найменняў у аб’ект дзяржаўнай палітыкі, які павінен быў дэманстраваць пануючую ў грамадстве ідэалогію. Была створана працэдура кантролю за выкананнем рашэння аб найменаванні (перайменаванні) праз адміністратыўныя рэсурсы, абавязковае ўсталяванне вулічных шыльдаў, сродкі масавай інфармацыі, паштовыя зносіны. Найважнейшае значэнне для ўмацавання інстытуцыянальнага спосабу мела рашэнне Мінгарвыканкама ў пачатку 1923 г. аб абавязковым выкананні перайменаванняў 1922 г., а таксама масавае найменаванне безыменных аб’ектаў і перайменаванне аб’ектаў з дубліраванымі назвамі ў 1928, 1931 і 1933 гг. Аўтаномны спосаб фарміравання на гэтым этапе быў моцна абмежаваны, а ў 1930-я гг. сустракаўся толькі сярод харонімаў. Назвы вуліцам і плошчам з пачатку 1930-х гг., а з 1938 г. і адміністратыўным раёнам прысвойваліся выключна інстытуцыянальна. На чацвёртым этапе (1945–1991 гг.) пры найменаванні адміністратыўных раёнаў, вуліц, плошчаў і паркаў панаваў інстытуцыянальны спосаб фарміравання ўрбананімнага ландшафту. Дзяржава падтрымлівала акрэсленую палітыку ў дачыненні да ўрбананіміі Мінска: унутрыгарадскія назвы павінны былі адпавядаць дзяржаўнай ідэалогіі. Назвы рабочых пасёлкаў, вёсак і мікрараёнаў уладамі былі выціснуты па-за межы прававога поля, паколькі не існавала эфектыўнай працэдуры па іх кантролі. Для найменавання новых рабочых пасёлкаў і мікрараёнаў прымяняўся аўтаномны спосаб – назвы ўзнікалі стыхійна [6; 7; 12; 16; 17; 34; 36].

3. Найважнейшымі фактарамі, якія ўплывалі на ўрбананімію Мінска ў 1793–1991 гг., былі сацыяльна-эканамічны і грамадска-палітычны. Уключэнне ў эканамічнае жыццё сельскагаспадарчых тэрыторый у межах горада прывяло ў XIX ст. да росту колькасці фальваркаў і ўрочышчаў. Адмена прыгону ў 1861 г., правядзенне чыгункі, рост капіталістычных адносін і ўрбанізацыя прывялі да хуткага павелічэння колькасці вуліц, слабод і прадмесцяў у Мінску ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аднак вырашальнае значэнне ў фарміраванні і трансфармацыі ўрбананіміі Мінска мелі грамадска-палітычныя змены (паўстанні, войны, рэвалюцыі). Рэакцыя Расійскай імперыі на паўстанне 1863–1864 гг. прывяла да першага ў гісторыі Мінска масавага перайменавання вуліц і плошчаў у межах русіфікатарскай палітыкі Расійскай імперыі. У 1914 г., калі пачалася Першая сусветная вайна паміж Расіяй і Германіяй, Пецярбургская вуліца была перайменавана ў Петраградскую. У 1917–1922 гг. у працэсе ўсталявання савецкай улады адбылася карэнная трансфармацыя ўрбананімнай сістэмы Мінска, калі асноўныя вуліцы горада змянілі свае назвы, якія сталі адпавядаць савецкай ідэалогіі. Унутрыгарадскія назвы ў 1920–1930-я гг. адлюстроўвалі ўсе грамадска-палітычныя перамены: НЭП (Біржавы завулак), беларусізацыю (спроба прысвоіць вуліцам імёны Ф. Скарыны, К. Каліноўскага і Янкі

Купалы), калектывізацыю (Калгасная і Саўгасная вуліцы), індустрыялізацыю (вуліцы Заводская, Рабочая, Фабрычная; шматлікія рабочыя пасёлкі), палітычныя рэпрэсіі (перайменаванне плошчы Троцкага і вуліц Бухарына, Каменева і інш.). У час польскай (1919–1920 гг.) і нямецка-фашысцкай (1941–1944 гг.) акупацый былі зроблены няўдалыя спробы радыкальнай змены ўнутрыгарадскіх назваў, калі акупанты масава перайменавалі вуліцы і плошчы Мінска. Аднак кароткія тэрміны акупацыі і адсутнасць дасканалай працэдуры кантролю не дазволілі гэтаму адбыцца. У 1945–1991 гг. урбананімны ландшафт Мінска разам з грамадствам перажыў усе асаблівасці сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР: масавую індустрыялізацыю ў першыя пасляваенныя пяцігодкі (пасёлкі Аўтазавода, Велазавода, Трактаразаводскі, ГПЗ-11 і інш.), культ асобы І. Сталіна (існаванне Сталінскага раёна, праспекта Сталіна, вуліц і раёнаў, названых у гонар ягонага акружэння), “хрушчоўскую адлігу” (прызнанне Мінскага антыфашысцкага падполля і ўшанаванне ў назвах вуліц ягоных удзельнікаў), мемарыялізацыю падзей Вялікай Айчыннай вайны як найважнейшы ідэалагічны фактар (што праявілася ў масавай мемарыялізацыі), “брэжнеўскі застой” (імклівае найменаванне вуліц у гонар толькі што памерлых В. Казлова, С. Прытыцкага, Ф. Сурганава, П. Машэрава, Ц. Кісялёва), “перабудову” (стварэнне ў 1986 г. грамадскай камісіі па найменаванні вуліц і фрагментарнае вяртанне гістарычных назваў). І, нарэшце, адлюстраванне ў назвах плошчы Незалежнасці і праспекта Скарыны палітычных перамен 1991 г. [1; 2; 3; 5; 7; 8; 9; 13; 14; 19; 22; 24; 25; 28; 29; 30; 31; 33; 37; 39; 40; 41; 42].

4. У 1793–1991 гг. унутрыгарадскія назвы фарміраваліся па некалькіх прынцыпах. У канцы XVIII – XIX ст. традыцыйным быў этна-рэлігійны, калі назвы ўказвалі на культавыя ўстановы розных веравызнанняў і месцы рассялення этнасаў: Васкрасенская, Ляхаўка, Татарская Слабада, Хрышчэнская, Юраўская і інш. Таксама часта выкарыстоўваўся тапаграфічны прынцып, калі ўнутрыгарадскія назвы адлюстроўвалі асаблівасці ландшафту і мясцовую тапаграфію: Залатая Горка, Круты Бераг, Сухая, Турэмная, Шырокая і інш. Назвы прысвойваліся па геаграфічным прынцыпе, калі ўрбанонімы фарміраваліся па геаграфічных аб’ектах: Бабруйская, Кальварыйская, Лошыцкая, Маскоўская, Нямігская і інш. У XIX ст. з’явіўся новы прафесійны прынцып, калі ўрбанонімы ўказвалі на заняткі і прафесіі мінчан: Бондараўская, Інвалідная, Кандуктарская, Рамізная, Фельдшарская і інш. Таксама новым быў геданімічны прынцып, згодна з якім назвы былі прыгожымі па гучанні, але нічога не значылі па сутнасці: Класная, Красная, Прыгожая, Слаўны і інш. У XIX ст. з’явіўся патранімічны прынцып, які прадугледжваў найменаванне аб’ектаў па імені або прозвішчы чалавека: Андрэеўская, Іванаўская, Іосіфаўская, Міхайлаўская і інш. Але толькі некалькі названых па гэтым прынцыпе вуліц ушаноўвалі да 1917 г. канкрэтных персон: Аляксандраўская, Захараўская, Мікалаеўская, Пушкінская, Скобелеўская. Пасля ўсталявання савецкай улады патранімічны прынцып стаў дамінаваць. Сярод асоб, у гонар якіх былі названы

ўнутрыгарадскія аб'екты, можна выдзеліць асобныя групы дзеячаў камуністычнай партыі, савецкай дзяржавы і міжнароднага камуністычнага руху (С. Кіраў, У. Ленін, К. Маркс, Ф. Энгельс і інш.); герояў грамадзянскай вайны, знакамітых паэтаў, пісьменнікаў, вучоных, лётчыкаў СССР 1920–1930-х гг. (У. Маякоўскі, В. Чапаеў, В. Чкалаў, М. Шчорс і інш.). Пасля Вялікай Айчыннай вайны, ва ўмовах з'яўлення значнай колькасці новых вуліц, вельмі запатрабаванай становіцца група дзеячаў рускай гісторыі і культуры (П. Баграціён, М. Кутузаў, М. Ламаносаў, К. Ціміразеў і інш.). Ваенная тэматыка была вельмі актуальнай, таму шмат вуліц было названа ў гонар салдат і афіцэраў Савецкай арміі – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны (М. Ватуцін, Л. Даватар, І. Зубачоў, Я. Фамін і інш.). Таксама шмат назваў вуліц ушаноўвалі партызан і падпольшчыкаў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны (К. Заслонаў, І. Кабушкін, І. Казінец, М. Кедышка і інш.). Самай невялікай па колькасці з'яўлялася група дзеячаў беларускай гісторыі і культуры (Янка Купала, Якуб Колас, Ф. Скарына і інш.). У эпоху СССР з'явіўся сімвалічны прынцып, калі назвы адпавядалі ідэалогіі, якая праводзілася ў дзяржаве (Інтэрнацыянальная, Камсамольская, Камуністычная, Савецкая і інш.). Таксама шырока выкарыстоўваўся ў другой палове XX ст. геаграфічны прынцып. Праўда, значная частка тых найменняў была створана па геаграфічных аб'ектах, непасрэдна не звязаных з Мінскам (Ахоцкая, Байкальская, Енісейская, Ілімская і інш.). Выкарыстоўваліся ў той час і тапаграфічны і геданімічны прынцыпы, а распаўсюджаны ў XIX ст. этна-рэлігійны прынцып у савецкі час не сустракаўся [4; 5; 6; 7; 8; 10; 11; 15; 17; 18; 20; 21; 23; 26; 27; 32; 33; 34; 36; 40; 43; 44].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання былі неаднаразова выкарыстаны ў сферы гарадской гаспадаркі пры рабоце Камісіі па найменаванні і перайменаванні вуліц і іншых састаўных частак г. Мінска пры Мінгарвыканкаме, членам якой з 2003 да 2023 г. з'яўляўся аўтар (акт укаранення ад 26 красавіка 2010 г.; выпіска з пратакола № 1/22 пасяджэння камісіі па найменаванні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых састаўных частак г. Мінска ад 15 красавіка 2022 г.). У 2016 г. матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы шыльдаў з гістарычнымі назвамі вуліц г. Мінска на тэрыторыі гістарычнага цэнтра. Таксама матэрыялы былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы карты-даведніка "Мінск-гістарычны", выдадзенай у 2021 г. Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе пры выкладанні курса "Гісторыя" ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце (акт укаранення ад 18 мая 2022 г.).

1. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры найменаванні або перайменаванні вуліц, паркаў, станцый метро, мікрараёнаў г. Мінска.

2. Матэрыялы дысертацыйнай работы могуць быць выкарыстаны ў турыстычнай галіне пры напісанні турыстычных маршрутаў, выданні буклетаў, таблічак і даведнікаў.

3. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе ў сярэдніх, сярэдніх спецыяльных, вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках, якія ўваходзяць у пералік выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў


1. Сацукевіч, І. І. Тапаніміка Мінска: прадмесці, слабоды і ўрочышчы ў пачатку ХХ стагоддзя / І. І. Сацукевіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі : навук. зб. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2002. – № 5. – С. 280–283.

2. Сацукевіч, І. І. Назвы прадмесцяў і ўрочышчаў Мінска ў 1793 – 1917 гадах / І. І. Сацукевіч // Гістарычна-археалагічны зборнік / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2008. – Вып. 24. – С. 66–69.

3. Сацукевіч, І. І. Назвы вуліц Мінска ў час савецка-польскай і Вялікай Айчыннай вайны / І. І. Сацукевіч // Научные труды Республиканского института высшей школы. Серия: Исторические и психолого-педагогические науки / Респ. ин-т. высш. шк. – 2009. – Вып. 8, ч. 1. – С. 166–172.

4. Сацукевич, И. И. Названия предместий, слобод, урочищ и фольварков Минска во второй половине XIX – начале XX вв. / И. И. Сацукевич // Вести Института современных знаний. – Минск, 2009. – № 4. – С. 43–47.

5. Сацукевіч, І. Назвы вуліц і плошчаў Мінска ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / І. Сацукевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2021. – № 2. – С. 11–18.

6. Сацукевіч, І. Назвы вуліц і плошчаў Мінска ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / І. Сацукевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2022. – № 3. – С. 29–35.

7. Сацукевіч, І. І. Адлюстраванне грамадска-палітычнага жыцця ў назвах прадмесцяў, урочышчаў, пасёлкаў і раёнаў Мінска ў 1917–1944 гг. / І. І. Сацукевіч // Научные труды Республиканского института высшей школы. Серия: Исторические и психолого-педагогические науки / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2022. – Вып. 22, ч. 2. – С. 184–191.

8. Сацукевіч, І. Назвы вуліц і плошчаў Мінска ў 1917–1922 гг. / І. Сацукевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2023. – № 6. – С. 26–33.


## Артыкулы ў іншых перыядычных выданнях і зборніках навуковых прац


9. Сацукевіч, І. І. Прадмесці / І. І. Сацукевіч // Памяць: Мінск : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі : у 5 кн. / уклад.: А. А. Ляўшэвіч, В. С. Семенякоў ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – Кн. 2. – С. 668–669.

10. Сацукевіч, І. І. Новыя назвы на картах і планах / І. І. Сацукевіч // Памяць : Мінск : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі : у 5 кн. / уклад.: А. А. Ляўшэвіч, В. С. Семенякоў ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў ; рэдкал.: Г. К.

Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БЕЛТА, 2005. – Кн. 4. – С. 59–60.

11. Сацукевіч, І. І. Гарадскі пейзаж: тэрыторыя і забудова / І. І. Сацукевіч // Гісторыя Мінска = История Минска / У. А. Бабкоў [і інш.] ; пад рэд. У. А. Бабкова. – Мінск : Беларус. энцык., 2006. – С. 212–231.

12. Сацукевіч, І. І. Праблемы аднаўлення гістарычнай урбананіміі Магілёва і Мінска / І. І. Сацукевіч // Гістарычнае і сацыякультурнае развіццё Магілёва : зб. навук. пр. удзельнікаў V Міжнар. навук. канф. «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць» / Магілёўс. дзярж. ун-т, Музей гісторыі Магілева ; уклад. І. А. Пушкін, В. В. Юдзін. – Магілёў, 2007. – С. 273–277.

13. Сацукевіч, І. І. Вёскі і пасёлкі, што ўвайшлі ў склад Мінска / І. І. Сацукевіч // Памяць : Мінск : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі : у 5 кн. / уклад.: А. А. Ляўшэвіч, В. С. Семенякоў ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2007. – Кн. 5, ч. 2. – С. 139–144.

14. Сацукевіч, І. І. Змены ў назвах мінскіх вуліц у 1986–2000 гг. / І. І. Сацукевіч // Памяць : Мінск : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі : у 5 кн. / уклад.: А. А. Ляўшэвіч, В. С. Семенякоў ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2007. – Кн. 5, ч. 2. – С. 151–153.

15. Сацукевіч, І. І. Вуліцы Мінска, названыя ў гонар падпольшчыкаў / І. І. Сацукевіч // Памяць : Мінск : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі : у 5 кн. / уклад.: А. А. Ляўшэвіч, В. С. Семенякоў ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2007. – Кн. 5, ч. 2. – С. 153–154.

16. Сацукевіч, І. І. Гісторыя і сучаснасць урбананіміі Гродна і Мінска (параўнаўчы аналіз) / І. І. Сацукевіч // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры : зб. навук. арт. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Т. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2007. – С. 366–371.

17. Сацукевіч, І. І. Назвы вуліц і плошчаў Мінска як гісторыка-культурная спадчына / І. І. Сацукевіч // ARCHE Пачатак. – Мінск, 2010. – № 3. – С. 324–341.

18. Сацукевіч, І. І. Тапаграфія і тапаніміка мінскага Замчышча і Траецкай Гары ў канцы XVIII – XX ст. / І. І. Сацукевіч // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць : да 945-годдзя Мінска : зб. навук. арт / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. А. І. Груша ; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 215–220.

19. Сацукевіч, І. І. Асаблівасці ўрбананіміі Мінска ў 1921–1941 гг. / І. І. Сацукевіч // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць : да 945-годдзя Мінска : зб. навук. арт / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. А. І. Груша ; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 441–447.

20. Сацукевич, И. И. Их именами названы… / И. И. Сацукевич // Их именами названы… Улицы Минска : энцикл. справ. / редкол.: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2014. – С. 5–7.

21. Сацукевич, И. И. Улицы района / И. И. Сацукевич // 60+5. Фрунзенский район города Минска, 1951–2016 / сост.: Н. В. Проскурова [и др.] ; под общ. ред. Б. А. Васильева. – Минск : Четыре четверти, 2016. – С. 49–57.

22. Сацукевіч, І. І. Лакалізацыя і тапаніміка рынкаў Мінска ў XIX – пачатку XX ст. / І. І. Сацукевіч // Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А. А. Скеп'ян, рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 308–311.

23. Сацукевич, И. И. Предыстория / И. И. Сацукевич // Московский район города Минска – 40 лет / И.И. Сацукевич [и др.]. ; под общей ред. А. П. Крепака, В. П. Бреля. – Минск, 2017. – С. 10–24.

24. Сацукевіч, І. Падзеі 1919–1921 гг. і назвы вуліц Мінска / І. Сацукевіч // Рыжскі мір 1921 года і Беларусь : (да 100-годдзя заключэння) : зборнік артыкулаў / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – С. 74–78.

25. Сацукевіч, І. І. Назвы прадмесцяў, слабод, урочышчаў, рабочых паселкаў, зяленых масіваў і раёнаў Мінска ў 1920 – 1930-я гг. / І. І. Сацукевіч // Мінск і мінчане : дзесяць стагоддзяў гісторыі : да 955-годдзя горада : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук. Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. Р. А. Аляхновіч ; рэдкал.: В. Л. Лакіза [і інш.]. – Минск, Беларус. навука, 2023. – С. 394–403.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

26. Сацукевіч, І. І. Урбанонімы (унутрыгарадскія назвы) Мінска этнічнага паходжання (канец XVIII – XX ст.) / І. І. Сацукевіч // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць : навук. канф., Мінск, 6–7 снеж. 2001 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Беларус. асац. гісторыкаў ; навук. рэд.: У. Навіцкі, М. Сташкевіч. – Мінск, 2001. – С. 375–378.

27. Сацукевіч, І. І. Урбанонімы татарскага паходжання Мінска ў канцы XVIII – XX стагоддзі / І. І. Сацукевіч // Мечети и мизары татар Беларуси, Литвы и Польши : к 100-летию второй Мин. мечети : материалы VIII междунар. науч.-практ. конф., Новогрудок, 5 июля 2002 г. / Мусульм. религиоз. об-ние в Респ. Беларусь, Белорус. обществ. об-ние татар "Зикр уль-Китаб" ; редкол.: И. Б. Канапацкий (отв. ред.), С. В. Думин, Е. Н. Филатова. – Новогрудок, 2003. – С. 49–51.

28. Сацукевіч, І. І. Перайменаванне вуліц Мінска як састаўная частка германскай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі (1941–1944) / І. І. Сацукевіч // Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры : материалы междунар. науч. конф., Брест, 17–19 апр. 2003 г. / Брест. гос. техн. ун-т ; редкол.: В. В. Тур [и др.]. – Брест, 2003. – С. 44–46.

29. Сацукевіч, І. І. Грамадска-палітычны ўплыў на тапаніміку зялёных масіваў Мінска / І. І. Сацукевіч // Современные стратегии развития мегаполисов и крупных городов. Материалы Междунар. научно-практ. конф., Минск, 9–10 октября 2003 г. / Под общ. ред. В. А. Бобкова и М. Я. Павлова. – Минск : МНИИСЭПП, 2003. – С. 377–380.

30. Сацукевіч, І. І. Карты і планы як крыніца па даследаванні гісторыі Мінска / І. І. Сацукевіч // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі : матэрылы Рэсп. навук.-практ. канф., 28 лістап. 2003 г. : у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: У. В. Тугай (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2003. – Ч. 2. – С. 271–274.

31. Сацукевіч, І. І. Перайменаванне вуліц Мінска ў час савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. / І. І. Сацукевіч // Стратегическое планирование и управление развитием городов : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 7–8 окт. 2004 г. : в 2 ч. / Мин. науч.-исслед. ин-т соц.-экон. и полит. проблем ; под общ. ред. В. А. Бобкова. – Минск, 2004. – Ч. 2. – С. 189–193.

32. Сацукевіч, І. І. Адлюстраванне канфесійнага жыцця ў назвах вуліц Мінска XIX – пачатку XX ст. / І. І. Сацукевіч // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць : зб. матэрыялаў міжнар. навук.-практ. канф., 7–8 кастр. 2004 г. / Кам. па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэсп. Беларусь, Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: У. П. Люкевіч, П. П. Крусь, Я. У. Скакун. – Брэст, 2005. – С. 82–85.

33. Сацукевіч, І. І. Назвы вуліц і плошчаў Мінска ў час нямецка-фашысцкай акупацыі / І. І. Сацукевіч // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: стан гістарыяграфіі і перспектывы даследаванняў праблемы : матэрыялы круглага стала, Мінск, 22 лістап. 2002 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі ; рэдкал.: А. А. Каваленя, А. М. Літвін (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 162–165.

34. Сацукевіч, І. І. Тапаніміка Мінска ў 1945–1985 гг. / І. І. Сацукевіч // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі : да 940-годдзя горада : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7–9 верас. 2007 г. / НАН Беларусі ; рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 333–337.

35.Сацукевіч, І. І. Да 940-годдзя Мінска: матэрыялы па тапаніміцы Мінска XIX – пачатку XX ст. у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (агляд крыніц) / І. І. Сацукевіч // Праблемы гістарыяграфіі, крыніцазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі ў Беларусі : матэрыялы круглага стала, прысвеч. 60-годдзю з дня нараджэння праф. У. М. Міхнюка, Мінск, 28 верас. 2007 г. / Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы ; склад. В. С. Пазднякоў, П. П. Журкевіч ; навук. рэд. У. І. Адамушка, А. Я. Рыбакоў. – Мінск, 2008. – С. 84–87.

36.Сацукевіч, І. І. Назвы вуліц Мінска ў 1945–1985 гг. / І. І. Сацукевіч // Молодежь в науке – 2009 : прил. к журн. "Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" : материалы междунар. науч. конф. молодых ученых, Минск,

21–24 апр. 2009 г. : в 5 ч. / Совет молодых ученых НАН Беларуси. – Минск, 2010. – Ч. 2 : Серия гуманитарных наук. – С. 32–35.

37. Сацукевіч, І. І. Назвы вуліц і плошчаў у міжваенны перыяд (1919–1940) / І. І. Сацукевіч // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі : да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 4–5 верас. 2009 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 176–181.

38. Сацукевіч, І. І. Харонімы Мінска ў 2-й палове XX – пачатку XXI стагоддзя / І. І. Сацукевіч // Материалы чтений, посвященных 95-летию со дня рождения доктора географических наук, профессора В. А. Жучкевича 10 марта 2011 г. / Белорус. гос. ун-т, Белорус. геогр. о-во ; редкол.: И. И. Пирожник (пред), Я. К. Еловичева, В. В. Махнач. – Минск, 2011. – С. 24–26.

39. Сацукевіч, І. І. Тапаграфія і тапаніміка Мінска ў гады Першай сусветнай вайны / І. І. Сацукевіч // Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. Мінск і Міншчына ў гады Першай сусветнай вайны: людзі і вайна: матэрыялы VIII беларус.-пол. навук.-тэарэтыч. канф. : Мінск, 9–10 крас. 2014 г. / Пол. ін-т у Мінску, БІП-Ін-т правазнаўства ; рэдкал.: А. Вялікі і З. Вінніцкі (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 103–109.

40. Сацукевіч, І. І. Мемарыялізацыя ўдзельнікаў партызанскага і падпольнага руху ў назвах вуліц Мінска / І. І. Сацукевіч // Беларусь: памятное лето 1944 года : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию освобождению Беларуси от нем.-фашист. захватчиков, Минск, 19–20 июня 2014 г. / НАН Беларуси ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2015. – С. 198–202.

41. Сацукевіч, І. І. Савецка-польская вайна і ўрбананімія Мінска / І. І. Сацукевіч // Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. Мінск і Міншчына пасля падзей 1921 года – лёсы людзей і краіны : матэрыялы X Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 13–14 верас. 2016 г. / Пол. Ін-т у Мінску, БІП – Ін-т правазнаўства ; рэдкал.: В. Вялікі [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 10–14.

42. Сацукевіч, І. Гістарычныя прадмесці і былыя вёскі на тэрыторыі Цэнтральнага раёна г. Мінска / І. Сацукевіч // Научно-практическая конференция "Центральный район – история и современность" : материалы конф., посвящ. 50-летию Центр. р-на г. Минска, 30 мая 2019 г. – Минск, 2019. – С. 76–77.

43. Сацукевіч, І. Памяць пра подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў назвах вуліц Мінска / І. Сацукевіч // Патриотическое воспитание и сохранение исторической памяти в системе высшего образования Беларуси: современное состояние и перспективы : сб. материалов междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12–13 мая 2022 г. / редкол.: Н. И. Полетаева [и др.]. – Минск : БГЭУ, 2022. – С. 96–98.

## Тэзісы дакладаў

44. Сацукевич, И. И. Урбанонимия Минска как предмет исторического исследования / И. И. Сацукевич // Современные проблемы школьного и вузовского географического образования и топонимических исследований: Тез. докл. Респ. науч.-практ. конф. 27–30 нояб. 2001 г., Минск / Белор. гос. ун-т ; Отв. ред. В. Н. Киселев. – Минск : БГУ, 2001. – С. 142–144.

**РЭЗЮМЭ**
**Сацукевіч Іван Іванавіч**
**Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)**

**Ключавыя словы:** урбананімія, найменаванні, перайменаванні, дзяржаўная палітыка, грамадска-палітычны, сацыяльна-эканамічны, вуліцы, завулкі, плошчы, прадмесці, паркі, пасёлкі, вёскі, мікрараёны, адміністратыўныя раёны.

**Мэта даследавання** – выявіць асаблівасці фарміравання і трансфармацыі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ва ўмовах сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных зменаў у 1793–1991 гг.

**Метады даследавання:** агульнанавуковыя: аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, параўнанне, абагульненне; спецыяльныя: гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалыгічны, гісторыка-сістэмны, рэтраспектыўны, міждысцыплінарны.

**Навуковая навізна даследавання:** дадзеная работа з’яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі спецыяльным комплексным даследаваннем унутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг. Упершыню на падставе шырокага кола крыніц аўтар сістэмна аналізуе працэс генэзісу ўнутрыгарадскіх найменняў Мінска і паказвае сувязь паміж урбанонімамі і сацыяльна-эканамічным, рэлігійным і палітычным развіццём Беларусі. Установлены спосабы і этапы фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. Вызначаны важнейшыя фактары фарміравання ўнутрыгарадскіх назваў у 1793–1991 гг. Раскрываюцца прычыны карэнных пераменаў ва ўрбананімным ландшафце Мінска ў дадзены перыяд. Вызначана колькасць вуліц і прадмесцяў Мінска і яе змяненні ў даследуемы перыяд. Складзены табліцы масавых перайменаванняў, прасочаны змены назваў важнейшых гарадскіх вуліц ад 1793 да 1991 гг. Прааналізаваны суадносіны паміж патранімічнымі і непатранімічнымі назвамі вуліц і вызначана іх структура. Вызначаны асноўныя прынцыпы найменавання ўрбанонімаў у 1793–1991 гг. Адноўлены і лакалізаваны дзясяткі страчаных у апошнія дзесяцігоддзі найменняў. Створана аснова для адраджэння забытых назваў у якасці назваў вуліц, плошчаў, мікрараёнаў, паркаў, станцый метро на сучасным этапе развіцця горада.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** палажэнні і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні прац па гісторыі Беларусі канца XVIII – XX ст., распрацоўцы гісторыі Мінска, гісторыі адукацыі; а таксама як матэрыял для турыстычных выданняў, гарадской інфраструктуры, музейных экспазіцый. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання былі неаднаразова выкарыстаны ў сферы гарадской гаспадаркі пры рабоце Камісіі па найменаванні і перайменаванні вуліц і іншых састаўных частак г. Мінска.

**Галіна выкарыстання:** гісторыя Беларусі, гісторыя Мінска, гісторыя адукацыі, гарадская, музейная і турыстычная сфера.

# РЕЗЮМЕ

**Сацукевич Иван Иванович**

**Урбанонимия Минска (1793–1991 гг.)**

**Ключевые слова:** урбанонимия, наименования, переименования, государственная политика, общественно-политический, социально-экономический, улицы, переулки, площади, предместья, парки, поселки, деревни, микрорайоны, административные районы.

**Цель исследования** – определить особенности формирования и трансформации внутригородских названий Минска в условиях социально-экономических и общественно-политических перемен в 1793–1991 гг.

**Методы исследования:** общенаучные: анализ и синтез, индукция и дедукция, сравнение, обобщение; специальные: историко-генетический, историко-типологический, историко-системный, ретроспективный, междисциплинарный.

**Научная новизна исследования:** данная работа является первым в отечественной историографии специальным комплексным исследованием внутригородских названий Минска в 1793–1991 гг. Впервые на основе широкого круга источников автор системно анализирует процесс генезиса внутригородских наименований Минска и показывает связь между урбанонимами и социально-экономическим, религиозным и политическим развитием Беларуси. Установлены способы и этапы формирования внутригородских названий в 1793–1991 гг. Определены важнейшие факторы формирования внутригородских названий в 1793–1991 гг. Раскрываются причины коренных перемен в урбанонимном ландшафте Минска в данный период. Определено количество улиц и площадей в исследуемый период. Составлены таблицы массовых переименований, прослежены изменения названий важнейших городских улиц от 1793 до 1991 г. Проанализировано соотношение между патронимическими и непатронимическими названиями улиц и определена их структура. Определены основные принципы наименования урбанонимов в 1793–1991 гг. Восстановлены и локализованы десятки потерянных на современном этапе развития города наименований. Создана основа для возрождения забытых названий в качестве наименований улиц, площадей, микрорайонов, парков, станций метро на современном этапе развития города.

**Рекомендации по использованию:** положения и результаты исследования могут быть использованы при написании работ по истории Беларуси конца XVIII – XX ст., разработке истории Минска, истории образования; а также как материал для туристических изданий, городской инфраструктуры, музейных экспозиций. Материалы диссертационного исследования неоднократно использованы в сфере городского хозяйства при работе Комиссии по наименовании и переименовании улиц и других составных частей г. Минска.

**Область применения:** история Беларуси, история Минска, история образования, городская, музейная и туристическая сфера.

## SUMMARY

**Satsukevich Ivan Ivanovich**

**Urbanonymy of Minsk (1793–1991)**

**Key words:** urbanonymy, names, renaming, state policy, socio-political, socio-economic, streets, lanes, squares, suburbs, parks, townships, villages, microdistricts, administrative districts.

**The aim** of the research is to determine the peculiarities of formation and transformation of inner-city names of Minsk under the conditions of socio-economic and socio-political changes in 1793–1991.

**Methods of research:** general scientific: analysis and synthesis, induction and deduction, comparison, generalization; special: historical-genetic, historical-typological, historical-systemic, retrospective, interdisciplinary.

**Scientific novelty of the research:** the present work is the first in the national historiography special complex research of the intracity names of Minsk in 1793–1991. For the first time on the basis of a wide range of sources the author systematically analyzes the process of genesis of inner-city names of Minsk and shows the relationship between urbanonyms and socio-economic, religious and political development of Belarus. The ways and stages of formation of intracity names in 1793–1991 are established. The most important factors of intracity names formation in 1793–1991 are determined. The reasons for radical changes in the urban landscape of Minsk during this period are disclosed. The number of streets and squares during the study period is determined. The tables of mass renaming are made, the changes of the names of the most important streets in the city are traced from 1793 to 1991. The correlation between the patronymic and non-patronymic names of the streets is analyzed, their structure is determined. The main principles of naming urbanonyms in 1793–1991 were defined. Dozens of names lost at the modern stage of the city development were restored and localized. The basis for the revival of forgotten names as the names of streets, squares, neighborhoods, parks, subway stations at the modern stage of the city development is created.

**Recommendations for use:** the provisions and results of the research can be used when writing works on the history of Belarus at the end of the XVIII–XX centuries, developing the history of Minsk, the history of education; as well as as material for tourist publications, urban infrastructure, museum expositions. The materials of the dissertation research have been repeatedly used in the field of urban management during the work of the Commission on the naming and renaming of streets and other components of the city of Minsk.

**Field of application:** history of Belarus, history of Minsk, history of education, urban, museum and tourist sphere.

